**Тэкст дыктанта
для правядзення ўступных іспытаў па беларускай мове
ў ДУА "Мінскае абласное кадэцкае вучылішча"
8 клас**

## Друкаванне кніг

Друк існаваў вельмі даўно. Спачатку нашы продкі друкавалі на тканіне. Былі гэта не літары, а ўзоры. Майстры мелі спецыяльныя дошчачкі з выразанымі на іх узорамі. Пацягнутыя фарбай, яны давалі адбіткі на палатне.

Пазней гэты спосаб быў перанесены на паперу. Выразаны на дрэве малюнак змазвалі фарбаю, потым на яго накладвалі чысты вільготны аркуш паперы. Зверху ён прыціскаўся цвёрдаю скураною падушкаю, напханай конскім валоссем. Выпуклыя абрысы малюнка, адціснутыя на паперы, пакідалі на ёй фарбу, і атрымліваўся выразны адбітак. Калі пад малюнкам патрэбны быў надпіс, яго рабілі ад рукі. Потым пачалі выразаць на дошках не толькі малюнкі, а і зробленыя такім жа чынам надпісы. А пасля дадумаліся выразаць цэлую старонку тэксту *(Паводле А. Клышкі).*
(110 слоў)